ЗАЦВЯРДЖАЮ
В.а. прарэктара па ідэалагічнай і выхаваўчай працы ўстановы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
________________ А.А. Бурык
«___» _______________ 2025 г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
________________ Т.В. Сянькевіч
«___» _______________ 2025 г.

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб адкрытым гарадскім конкурсе інсцэніровак**
**па творах беларускай літаратуры і фальклору**

Конкурс праводзіцца згодна з планам працы БрДУ імя А.С. Пушкіна. У ім могуць прыняць удзел студэнты розных факультэтаў БрДУ імя А.С. Пушкіна, навучэнцы каледжаў і вучні сярэдніх навучальных устаноў.

**Арганізатар** конкурсу – кафедра беларускага і рускага літаратуразнаўства і журналістыкі ўстановы адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”.

**Аргкамітэт** конкурсу:

1. Мельнікава З.П. – прафесар кафедры беларускага і рускага літаратуразнаўства і журналістыкі, доктар філалагічных навук, прафесар;
2. Кавалюк А.С. – дацэнт кафедры беларускага і рускага літаратуразнаўства і журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
3. Шчэрба С.М. – дацэнт кафедры беларускага і рускага літаратуразнаўства і журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**Мэта і задачы конкурсу:**

– папулярызацыя літаратурнай і фальклорнай спадчыны Беларусі;
– выяўленне лепшых калектываў і выканаўцаў твораў беларускіх пісьменнікаў і фальклору;
– развіццё інтэлектуальных і творчых здольнасцей моладзі;
– выхаванне патрыятычных і грамадзянскіх пачуццяў у моладзі праз мастацтва слова.

**Умовы правядзення конкурсу**

Конкурс праводзіцца ў завочнай форме.

Да **27 сакавіка 2025 года** ўдзельнікі **прысылаюць відэа** з запісам пастаноўкі на e-mail: ruslitjurn@brsu.by

**Працягласць выступлення:** да 15 хвілін.

**Крытэрыі ацэнкі інсцэніроўкі:**

– мастацкая каштоўнасць матэрыялу;
– рэжысёрскае ўвасабленне пастаноўкі;
– акцёрскае майстэрства (эмацыянальнасць, натуральнасць, артыстызм, выразнасць мовы).

**Падвядзенне вынікаў конкурсу**

Вынікі конкурсу падводзяцца журы, у склад якога ўваходзяць члены аргкамітэта. Пераможцы вызначаюцца ў розных узроставых групах і намінацыях і ўзнагароджваюцца дыпломамі.

Падвядзенне вынікаў – да **2 красавіка 2025 года**.

Вынікі конкурсу інсцэніровак будуць размешчаны на старонцы кафедры беларускага і рускага літаратуразнаўства і журналістыкі. Пераможцы будуць узнагароджаны дыпломамі.

Для ўдзелу ў конкурсе неабходна падаць пісьмовую заяўку на кафедру беларускага і рускага літаратуразнаўства і журналістыкі (224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28, каб. 311 вучэбнага корпуса № 2) ці па электронным адрасе ruslitjurn@brsu.by не пазней, чым **25 сакавіка 2025 года** па форме:

ЗАЯЎКА

Навучальная установа ________________________________________
клас (факультэт, курс, група ) _____________________________________
Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка ________________________
_________________________________________________________________
Назва пастаноўкі, аўтар і назва твора____________________________
_________________________________________________________________

Звесткі аб удзельніках (прозвішча, імя, імя па бацьку)
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________

Кантактны тэлефон, электронны адрас______________________________

Кантактныя тэлефоны:
(+ 375 29) 7951931; (+ 375 25) 5377147 – Кавалюк Алена Сцяпанаўна – дацэнт кафедры беларускага і рускага літаратуразнаўства і журналістыкі.